Аўтар і вядучая рубрыкі — Таццяна КОМАНАВА

# ECCE HOMO

*"Не шаную Тэатра, не імкнуся да Тэатра і не лічуся з Тэатрам. Тэатр (бачыць вачамі) мне заўсёды здаваўся падмогай для духоўных жабракоў, забеспячэннем для хітрунoў пароды Фамы Бязвернага, якія толькі ў тое вераць, што бачаць, больш таго: у тое, што на дотык адчуваюць. — Нейкай азбукай для сляпых".*

Марына Цвятаева



# НА "СЦЭНЕ ПЛАСТЫЧНАЙ"

**У наш час, багаты на ўсялякія "shows", «stars» і "makers", калі мастацтва, і асабліва тэатр, перад усім — відовішча, мы хацелі б расказаць вам пра з'яву процілеглую, гэткі тэатр для Марыны Цвятаевай, "дзе не вачамі бачаць". "Сцэна Пластычна" заснавана пры Каталіцкім універсітэце ў Любліне ў 1969 годзе і да сённяшняга часу — з'ява унікальная і фенаменальная ў кантэксце тэатральнай культуры не толькі Усходняй Еўропы, але і ўсяго свету.**

Заснавальнік "Сцэны Пластычнай" і стваральнік шасцідзесяці яе пастановак (сярод якіх "Ecce Homo", "Нараджэнне", "Вільгаць", "Бераг", "Саван" і іншыя) Лешэк Мондзік выступаў таксама ў якасці сцэнографа ў тэатрах Польшчы, Партугаліі, Германіі, Францыі. Выкладчык у некалькіх акцёрскіх школах, удзельнік дзесяткаў тэатральных фестываляў, лаўрэат многіх з іх — ужо даўно закаханы ў тэатр без слоў. Паводле ўласнага сцвярджэння аўтара, маўчанне ў спектаклях паходзіць з яго ўпэўненасці ў тым, што "існуюць рэчы, якія не падуладныя словам. Калі гаворым пра іх, то непазбежна калечым і дэфармуем". Магчыма, аднак жа, пераказаць іх больш глыбока і праўдзіва, ужываючы адпаведныя сродкі мастацкага выяўлення. Бо тое патаемнае, што ў нас глыбока схавана, — падсвядомыя жаданні і экзістэнцыяльныя станы, — розум ніколі ў пэўнай меры не ахопіць.

Люблінскі мастак у сваім "касмічным" тэатры ажыўляе і рэабілітуе схаваныя ў памяці стэрэатыпы, вяртаючы гледачам магчымасць ірацыянальнага погляду на свет.

*"Пульсуе біялагічным рытмам музыка. Адкрытая цёмная прастора, што паглынае ўсіх і ўсё, заходзіцца мокрым пламатычным брудам. Арганічнасць, рассападобнасць, вільгаць... Раптам у гэтых грозных заслонах з'яўляецца светлае вакно. Потым другое, трэцяе. У гэтых вокнах, быццам расчыненых у іншую рэальнасць, паволі крышталізуюцца твары людзей. Спадаюць гіпсавыя маскі. Чысціня і моц фарбаў, чырвоныя вусны, ясныя вочы. А навокал шалее мокрая цемра".* (З апісання "Вільгаці")

Тэатр Лешэка Мондзіка ахутвае гледача незвычайнай аурай. Гэтую прастору наўрад ці можна назваць тэатральнай: святло і цемра паглынаюць вас настолькі, што вы забываецеся пра сцэнічную ўмоўнасць і час. Пасля некалькіх секунд? (хвілін? гадзін?) абсалютнага святла альбо такой жа абсалютнай цемры тое, што адбываецца на сцэне, здаецца стварэннем уласнай (пад)свядомасці.

Галюцынацыі? Адкрыцці? Кожнаму — сваё. Але пачуццё класічнага назірання падчас знаходжання ў лабараторыі Лешэка Мондзіка губляецца начыста.

Пытанне, якое задае Анджэй Вайда, цікавіць амаль кожнага, хто сутыкнуўся са "Сцэнай Пластычнай": *"Ці з'яўляецца гэта тэатрам? Можа, гэта ёсць з'ява паратэатральная? Не ведаю, бясспрэчна мяне не цікавіць. Гледзячы на гэта, перажываю нешта, чаго не адчуваю ў іншым тэатры..."*

"Ці з'яўляецца гэта тэатрам?" Згодна з традыцыйнымі кампанентамі тэатра (фабула, дзея, галоўная роля акцёра, дыялогі) — зразумела, не.

Замест драматургіі тут пануе ідэя, якая падпарадкоўвае формы, фарбы, вобразы, рытмы і мелодыі. Такім чынам, крохкі універсум спектакляў майстра будуецца на ценях і рухах вытанчаных пластычных форм, якія звязаны рытмам музыкі і гукаў. Рытм — біццё сэрца, дыханне — асноўнае, што было ад Пачатку. Дзякуючы такому выкарыстанню музыкі, Лешэк Мондзік перадае, кажучы словамі Стэфаніі Станюты, "*...моц і яскравасць таго няпэўнага, загадкавага, містычнага..., што якраз і не даецца вызначэнням лагічным, слоўным...*"

У шэрагу выяўленчых сродкаў Лешэка Мондзіка стаяць і акцёры. І толькі як праваднікі яго ідэі, сродкі яе адлюстравання (магчыма, менавіта таму на сцэне задзейнічаны не прафесіяналы, а студэнты Каталіцкага ўніверсітэта).

"Сцэна Пластычна" знаходзіцца на памежжы ўсіх відаў мастацтва: тэатра, музыкі, жывапісу. Ёсць і яшчэ адна мяжа: усе словы і Слова, якое было на Пачатку, і тут не вымаўляецца, але не адчуць яго немагчыма. *"На пачатку было Слова. І Слова было ў Бога. І Слова было Бог"*. Рэлігійнасць, блізкая да містыкі Сярэднявечча, і мастацтва, блізкае да рэлігіі: твор павінен праводзіць чалавека праз катарсіс, праз стан ачышчэння, ставіць перад ім глабальныя пытанні быцця. А адказы — справа асабістай веры. Асноўныя лабірынты, па якіх водзіць нас творца, — гэта каханне, страх, святасць, узлёты і падзенні, але галоўнае — пранізлівае адчуванне непазбежнасці канца, смерці.

Містэрыі Лешэка Мондзіка — гэта праўда пра чалавека, які хоча зразумець і перажыць сэнс свайго тут знаходжання, пазбавіцца страху, прыстаць да якога-небудзь берага.

*"Ніводная рука не скранулася для апладысментаў. Уражанне ашаламляе і паглынае. Вобразы занадта моцныя, вобразы, што, як міф, паказваюць першабытныя сітуацыі нейкага перадрацыянальнага ўспрымання свету".* (Эвеліна Пройс, Hamburger Abendblatt)

Глядач застаецца "самотным у натоўпе", бо ад іншых гледачоў і ад сцэны яго аддзяляе змрок. Сваімі ўяўленнямі Лешэк Мондзік прабіваецца праз іншыя вымярэнні рэчаіснасці, дзе пануюць добрыя і злыя сілы, імкнецца дасягнуць паразумення са светам — сцэнічным і пазасцэнічным. Кожны раз ён адбірае ў нас шчаслівенькі "мірО.К.", прымушае адчуць пранізлівы, пакутлівы боль самога існавання і пакідае ў найвышэйшай адзіноце, што бывае толькі ў апошнія хвіліны перад пачаткам і скачэннем... Жыцця.

P.S. Выказваем глыбокую ўдзячнасць стваральніку "Сцэны Пластычнай" Лешэку Мондзіку за дапамогу ў напісанні гэтага артыкула.

Ірына ГЕРАСІМОВІЧ,
Таццяна ШЫМУК